Васіль СТАРЫЧОНАК

# «…ЖЫВЕ РАЎЧУК ЖЫЦЦЯ»: МЕТАФАРЫ ЭКЗІСТЭНЦЫЙНАГА ХАРАКТАРУ

Сярод вялікай колькасці метафар найбольш пашыранымі з’яўляюцца метафары экзістэнцыяльнага (лац. *exsistentia* ‘існаванне’) тыпу. Яны арыентаваны на выяўленне разнастайных аспектаў быцця чалавека, яго дзейнасці, асаблівасцей успрымання, разумення і ацэньвання асобай жыцця і навакольнай рэчаіснасці. Асноўны змест такіх метафар — духоўныя асновы быцця, месца чалавека ў светабудове, яго непарыўныя сувязі з навакольным светам.

Многія метафары звязаны з сімвалізацыяй жыццёвага шляху чалавека, яго долі, лёсу, адлюстраваннем жыццёвых выпрабаванняў, нягод, складаных і цяжкіх сітуацый, з якімі даводзіцца сустракацца чалавеку, з канстатацыяй апошняга шляху чалавека, яго смерці, пагібелі. Даволі распаўсюджанымі з’яўляюцца параўнанні жыцця чалавека з дарогай, сцежкай, шляхам, полем (*каляя, гасцінец, бальшак, поле, ралля),* з пэўнымі порамі года і пэўным часам сутак *(восень, зіма, золак, світанак, ранак, ранне, вечар, змярканне).* Асацыяцыі жыццёвага шляху з *экспрэсам, цягніком, лодкай, чоўнам, караблём* і іншымі транспартнымі сродкамі падкрэсліваюць імклівасць жыцця, яго непарыўны рух наперад. Атаясамліванне жыццёвай плыні і вады назіраецца ў назоўніках *рака, возера, раўчук*. Сэнсавыя структуры полісемантаў *вадаспад, паводка, хваля* ўскладняюцца семамі ‘інтэнсіўнасць’, ‘актыўнасць’, ‘узмоцненасць’. Стыхія, бурнае праяўленне прыродных з’яў , непагадзь у беларускіх пісьменнікаў, як правіла, суадносяцца з цяжкасцямі жыцця, бядой, няшчасцем (*непагадзь, непагода, завея, імжа, хмара, вецер, скразняк, гром, пярун, шторм, градабой, буралом).* Разнастайныя нюансы жыцця, яго мнагастайнасць і шматбаковасць выяўляюцца ў сэнсавых структурах полісемантаў *сувой, стог, каравай, кубак, вянок, ветах*, *свечка, каганец, узбярэжжа, ускраек, небасхіл, крос, карыда, тартак баль*, *саван* і мн. інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Індывідуальна-аўтарскія метафары (разгорнутыя і неразгорнутыя) не фіксуюцца ў тлумачальных слоўніках беларускай мовы. У мове мастацкай літаратуры яны выконваюць не столькі інфармацыйную, колькі эстэтычнукю функцыю, характарызуюцца нестандартнай спалучальнасцю, што дазваляе актывізаваць закладзены ў слове глыбінны семантычны патэнцыял, выклікаць новыя (часам нечаканыя і нестандартныя) вобразы і ўяўленні.

Пры метафарах, якія захоўваюць сувязь з першасным значэннем і развіваюцца ў межах дзеяння рэгулярных і прадуктыўных мадэляў, пасля загалоўнага слова прыводзяцца іх тлумачэнне. Да астатніх індывідуальна-аўтарскіх метафар дэфініцыі не прыводзяцца, г. зн. не навязваецца аўтарскі пункт гледжання, а даецца магчымасць самім чытачам асэнсаваць сутнасць метафарычнага пераўтварэння і адшукаць тыя бачныя і нябачныя сувязі з першасным значэннем.

**Акіян**. *Але ў маёй крыві, хоць хворасць гне мой стан, — яшчэ на ўсё шуміць* ***юнацкі акіян.*** (Ю. Таўбін)

**Арэлі юнацтва**.І *як бы мы ні пастарэлі, Няхай і летам і зімой* ***Юнацтва*** *сінія* ***арэлі*** *Ляцяць між небам і зямлёй...* (Г. Бураўкін)

**Баль жыцця.** *На* ***балі жыцця*** *шумнага Не ўсім адзін абед...* (Я. Купала)

**Бальшак жыцця** ‘жыццёвы шлях’**.** *На* ***бальшаках жыцця****, крутых і звонкіх, Нас сцерагуць памылкі, як палонкі.* (К. Цвірка) *На* ***жыццёвых бальшаках*** *падбіўся, Ад густой пазёмкі пасівеў.* (Г. Бураўкін)

**Бездань жыцця.** *Звярнула ў* ***бездань жыцця*** *дарога, сціхае спеў... Узнёсла марыў, задумаў многа — ды не паспеў...* (С. Давідовіч)

**Бездарожжа жыцця** ‘жыццёвая неакрэсленасць, няяснасць’. *Праўда — посах пілігрыма Ў* ***бездарожжы жыцця****.* (Л. Геніюш)

**Бераг дзяцінства (маленства), юнацтва.** ***Дзяцінства бераг*** *хутка аддаляўся, Я не лічыў растрачаных гадоў. І ліставей асенні мякка слаўся На тоненькую нітачку слядоў.* (С. Сяргей) *Вярнуцца б у казку назад, у ружовасць дзяцінства, на* ***бераг маленства****.* (С. Давідовіч) *Сняцца мне* ***юнацтва***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***берагі***. (В. Гардзей) *А хочацца зачапіцца багром за* ***бераг юнацтва***. (Р. Барадулін) *Паехалі, паэце, у Міхалкі, Там, ведаю,* ***юнацтва бераг*** *твой.* (У. Верамейчык)

**Бруя** ‘выток, пачатак юнацкага жыцця’. *Не дадзена нікому зноў пабыць Каля бруі юнацкае крыніцы.* (У. Паўлаў)

**Буралом** ‘жыццёвыя нягоды, непрыемнасці’. *Ды не вернуцца болей Дзён былых буралomы-завеі: Як цвітуць залатыя лілеі, — Не гуляе віхура над полем.* (М. Багун). *Няўжо мне так наканавана — Ісці ўвесь час праз буралом?* (А. Майсеенка) *Наперадзе ў цябе зіхаціць прыгожая, вялікая мэта, а па дарозе да яе — дзікія прорвы, буралом.* (М. Паслядовіч)

**Бяседа** 'жыццёвая гамана’. *Час усё скапыціў наўкол, Свет цямнець навучыўся ў медзі. І прыходзіць канец бяседзе.* (Р. Барадулін)

**Вадаспад жыцця.** *І на турбіну пачуцця Вось гэтак жа нябачна Б’е* ***вадаспад*** *майго* ***жыцця****, Што перажыў і ўбачыў. (*А. Сербантовіч)

**Валун жыцця.** ***Жыцця валун*** *з надзеяю нясём, а ён нам да крыві сцірае плечы.* (А. Емяльянаў)

**Ветах жыцця.** *І адарае нас хітраю рэштаю хітра прыжмураны* ***ветах жыцця***. (Р. Барадулін)

**Вецер лёсу**. *Ды золкі* ***вецер лёсу*** *выстудзіў Мае надзеі і шляхі, І жорсткі час рахунак выставіў За чысціню, як за грахі.* (М. Пазнякоў)

**Вечар жыцця** ‘сталая пара жыцця’. ***Вечар жыцця*** *ўжо ступіў на парог, моўчкі да нас прабіраецца ў сені.* (Л. Геніюш)

**Вільчык гадоў**. *Потым на* ***вільчыку*** *ўсіх* ***гадоў****, Дзе пенсіёншчына сніцца, Трэсці заслужана барадой, Ментарства сеючы з сітца.* (М. Калачынскі)

**Вёслы маленства.** *На той зямлі, дзе ў зорны час Пакінуты* ***маленства вёслы****, Каторы год без нас, без нас Па колкіх броўках ходзяць вёсны.* (К. Цвірка)

**Веснаход дзён.** Жыццёвая бура, сумятня. *Яшчэ шмат хто глядзіць мо’ варожа На ўспененых* ***дзён веснаход***. (А. Гурло)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Водар маленства.** *Ды ты не ведаеш, што такое пах і* ***водар маленства****, не разумееш, чаму чарнільная пляма, выпадкова ўбачаная на снезе, можа хваляваць мацней, чым самае сталае дзіва.* (М. Стральцоў)

**Возера быцця.** *Прыйшоў і я да* ***возера быцця****, Каб паглядзець у глыбіню, напіцца.* (У. Клішэвіч)

**Восень** '**с**талая пара жыцця чалавека'. *Восень — гэта вечар года.* (Я. Сіпакоў) *Хоць далёка з табою нам, сэрца, Да восені, Ды няма ўсё ж калі Склаўшы рукі сядзець.* (У. Паўлаў) *Восень мая наперадзе, толькі ці прыйдзе яна.* (П. Шруб) *Жыцця, здаецца, толькі быў пралог, А ўжо ідзе пары жыццёвай восень.* (М. Віняцкі) *Зрабіць не шмат мне засталося: Святлом душы дамаляваць* ***Жыцця*** *бярозавую* ***восень****.* (З. Марозаў)

**Выбоіны** 'жыццёвыя няўдачы, непрыемнасці'. *На дрогкіх выбоінах Шляху зямнога Згубілася многа, Забылася многа.* (Г. Бураўкін) *Бо позна спаць — і радасці не знаць, Усё жыццё кагосьці даганяць І праклінаць выбоіны і ямкі.* (Х. Жычка) *Жыццё, такое прывабнае, калі на яго глядзець збоку, паказала яму [Алесю] цяпер свае выбоіны і калдобы.* (П. Броўка)

**Вырай.** *Ён [А. Куляшоў] быў пявучым магілёўскім птахам І ў незваротны вырай адляцеў.* (Г. Бураўкін) *Не стала мамы... Не стала таты.. На чорных крылах адплылі яны ў вечны вырай.* (С. Давідовіч) *Не хацелася дзядзьку ў гэты вырай збірацца.* (М. Лужанін)

**Вянок жыцця.** *Ў* ***вянок жыцця*** *і дум паэта ты дні дзяцінства завіла.* (П. Трус)

**Гасцінец** 'жыццёвы шлях'. *Жыццё — гасцінец, гады — як вёрсты, Канец жыццёвы — то небаспад. Ідзеш паволі, што далей — болей Тых вёрст жыццёвых цячэ назад.* (А. Гарун)

**Госць** 'жыхар зямлі, жыццё якога (у параўнані з вечнасцю) кароткае, часовае'. *Мы на Зямлі, сцвярджаюць, толькі госці, Але не ўсім аднолькава гасціць.* (А. Дуброўскі) *Што цвіце — адцвіце. Сон-травой мы адыдзем, прахожыя, госці.* (В. Жуковіч) *На зямлі я па жыцці — госць, чорнай ноччу адыду ў цень.* (М. Адам).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Гром** ‘бяда, гора’. *І грымнуў **гром**: у нашы дзверы Пастукаўся ўначы канвой.* (С. Грахоўскі)

**Дажынкі** ‘канец жыццёвага шляху, смерць’. *Усё бліжэй **жыцця дажынкі.** Назубіць серп скупая старасць.* (М. Маляўка) *І калі ўжо надыдзе старасць, Дажынкі прыйдзецца спраўляць: Забудзь, хоць на адным гектары Калоссе чыста падабраць.* (М. Чарняўскі). ***Быцця** свайго бачыш **дажынкі**, Падводзіш рахунак былому.* (Я. Купала) *Смерць управілася з дажынкамі. Як казалі даўней: амінь!..* (В. Тарас) *Калі прыйшлі жыцця яго дажынкі, І сталі ў рад гады, нібы снапы, Пайшоў ён полем, вузенькай сцяжынкай. І сам ён быў, як колас залаты.* (Л. Дайнека)

**Дрэва жыцця**. *І доўжыцца, доўжыцца Вечнасць — зялёнае **Дрэва жыцця***. (Г. Твардовіч) *З **дрэва** вечнага **жыцця** зляцім... Як лісты бязрадасныя ў вечнасць, Да нашчадкаў нашых паляцім.* (П. Саковіч)

**Жарства**. *Прытупіў сэрца я аб **жарству Год** цяжкіх, што мінулі, як здань.* (Я. Купала) *То ўсё хлусня, то ўсё мана, Бо час душу не ўкрыў жарствой.* (А. Астрэйка)

**Завея**. *Каб ты ведала, колькі **жыццёвых завей** Нам яшчэ давядзецца адолець.* (З. Марозаў) *Каб **завеі** жыццёвая **замець** Не завеяла нашых слядоў, Гімнасцёрку, як бацькаву памяць, Я збярог для сваіх сыноў.* (М. Хведаровіч)

**Загон**. ***Загон** сваіх дужых **дзён** сярпом разгубленым дажынаю.* (Р. Барадулін) ***Загон жыццёвы** мой засеян, Я бачу сціплы яго плён.* (П. Пранузa)

**Зіма** ‘сталая пара жыцця, старасць’. *Пакуль вясна твая красуе І не прыйшла **жыцця зіма,** Пакуль у целе кроў пульсуе, Жыві, каб чуць у жыцці смак!* (Я. Золак) *А ў духмяных сумётах акацый Дацвітае мая зіма.* (Н. Мацяш) *Я не спяшаюся зіму сустрэць, пакуль гасцюе лета ў сэрцах нашых.* (Р. Барадулін)

**Змярканне** ‘сталая пара жыцця, старасць’. *За крокам крок. І дзень за днём. Усход жыцця. Жыцця змярканне. Нас паліць стоеным агнём Вялікай страты прадчуванне.* (Л. Дайнека) *І вясновае ранне, І ружовы усход, Не*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*спяшайся,* ***змярканне*** *Маладых маіх* ***год.*** (Г. Дашкевіч) *Майго* ***змяркання*** *рыска залатая.* (Р. Барадулін)

**Зруб маладосці.** *Скласці б гады, як бярвенне, у* ***зруб маладосці*** *маёй.* (В. Гарановіч)

**Імжа** ‘складаны жыццёвы шлях’. *У жыццёвай імжы я каханне, як ношу, пранясу у душы.* (В. Гарановіч) *Буду скрозь* ***гадоў імжу*** *густую Помніць я і радасць, і тугу, Воч тваіх загадкавасць святую, Верасоў шчымлівую смугу.* (У. Гетманчук)

**Каганец** ‘жыццё’. *Скончыць смерць падрахунак і спрэчку І задзьмухне* ***жыцця каганец.(***У. Жылка) *Як толькі мой датлее каганец, Складу свае ўсе абавязкі, Бо набліжаецца канец Вясёлае і сумнай казкі.* (С. Грахоўскі)

**Каляя лёсу** ‘жыццёвая дарога’**.** *Якім ты ёсць і стаць якім гатовы, — Хай светлай будзе* ***лёсу каляя****.* (Н. Мацяш)

**Камель жыцця**. *Тады адчуў, які ён цяжкі,* ***Жыцця камель****, што я цягну.* (У. Марук)

**Карабель** ‘жыццёвы шлях’. ***Карабель*** *мой* ***жыццёвы*** *спыніўся над Влтавай сіняй.* (Л. Геніюш)

**Каравай** ‘доля, лёс’. *Так жыць на свеце трэба, каб... знаць, што* ***жыццёвы каравай*** *бывае часам горкі.* (А. Грачанікаў)

**Карыда** ‘цяжкае жыццё’. *Жыццё яго — бясконцая* ***карыда****. Не крыўдзіце старога інваліда.* (А. Сербантовіч)

**Кастры юнацтва.** ***Кастры*** *майго* ***юнацтва*** *дагарэлі, На расцяробах выраслі лясы.* (С. Грахоўскі)

**Кон** ‘лёс, доля, планіда’. *А з маладосці толку мала — Такі, відаць, ужо мой кон.* (Я. Колас) *Ды знаем: над усімі імі Спрадвеку (конам, лёсам назаві) Ёсць тое, што ўсіх робіць нас святымі — Гармонія красы, дабра, любві.* (А. Лойка)

**Красворд жыцця.** *Туманіцца* ***жыцця красворд****.* (А. Майсеенка)

**Крос** ‘жыццёвы шлях’**.** *Мы ўсе на гэтым свеце — госці. Жыццё людзей — імклівы крос.* (А. Сербантовіч)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Крэпдэшын маладосці**. *Сумую па юным **крэпдэшыне** начной **маладосці**...* (Л. Дранько-Майсюк)

**Кубак** ‘адмераны жыццёвы шлях’. *У кожнага зорка свая, Кожнаму кубак наліты. У кожнага доля свая, Ці, як кажуць, планіда.* (А. Пісьмянкоў) ***Кубак жыцця** ледзь надпіты*. (В. Гардзей)

**Латарэя** ‘лёс, доля’. *Юрый адчувае — у Сяргея з самага таго дня, як навучыўся хадзіць, была правільная, роўная дарожка: яму, маладзейшаму гадоў на восем, выпала шчаслівая латарэя.* (І. Навуменка) *Кожны крок мой рашаючы — Латарэя без выйгрышу.* (В. Стрыжак)

**Лістапад** ‘сталасць жыцця’. *Так і паэт, натхнення брат: Вясна бушуе ў словах, А ўжо на сэрцы лістапад Зашэптвае замовы.* (В. Зуёнак) *Даўно мае сяброўкі састарэлі, Сяброў змятае лістапад.* (С. Грахоўскі)

**Лодка жыцця.** *Ад першае вясновае паводкі, Ад самых першых памятлівых дзён Свайго **жыцця** пахісліваю **лодку** На плынь выводжу, быццам плытагон.* (У. Паўлаў)

**Маладзік маленства.** ***Маладзік маленства** бліснуў. Хлопцы слухаюць расказ Пра такі, здаецца, блізкі І такі далёкі час.* (М. Маляўка)

**Маладзічок жыцця.** ***Жыцця маладзічок**, час папараці-кветкі...* (В. Гарановіч)

**Млын.** *Ляцяць на **млын Гадоў** гарачых Маіх пачуццяў рэкі.* (В. Стрыжак) *І свой герой у кожным часе, свой **млын падзей***. (К. Камейша)

**Небасхіл жыцця.** *Людзі-зоркі: запаляцца ў свеце, Замігацяць навокал, зазіхцяць І, колькі трэба, Зямлі пасвяцячы, Скоцяцца зноў з **небасхілу жыцця.*** (К. Цвірка)

**Непагадзь** ‘жыццёвая цяжкасць’. *На двары і на сэрцы непагадзь. І, як часта бывае ў жыцці, Не хапае праменьчыка нейкага, Каб навокал усё асвяціць*. (Р. Тармола)

**Непагода** ‘гады цяжкага, змрочнага жыцця’. *Ты не бядуй, што ў нашым лёсе Было так многа непагоды*. (П. Прыходзька) *Марнелі нашы гоні У **холадзе** жыццёвых **непагод***. (Я. Колас)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Нерат** ‘пастка, жыццёвы тупік’ *Эх, хаця б напачатку Абмінуць нераты: Цвёрда ставіць пячатку Смерць — рэдактар круты.* (С. Гаўрусёў) *Гэтак жа б’ешся і ты, чалавеча, Злоўлены ў* ***нерат жыцця****.* (Я. Золак) *Завяла мяне ты ў нерат, Не пайду назад. Наперад! Бо прыняў як пакаранне Тваё цяжкае прызнанне.* (В. Гарановіч)

**Ноч** ‘сталы перыяд жыцця’. *І дні жыцця прыйшлі да ночы.* (У. Жылка) *Жыццё наша — ноч і цьма.* (Я. Колас)

**Паводка жыцця**. *І якая* ***паводка жыцця****, Як плаціну, яе [дамбу страсці] прарвала?* (А. Бачыла)

**Паром** ‘жыццёвы шлях’. *Наша старасць не адпачывае, Бо жыццё — нагружаны паром. (*П. Прануза)

**Пераправа.** ***Жыцця*** *майго і* ***смерці пераправы,*** *агонь і снег дагэтуль сняцца мне.* (А. Вялюгін) *Падаюць дзеці на шыгал, на травы, А* ***да жыцця*** *— няма* ***пераправы****.* (А. Грачанікаў)

**Поезд вясны**. *Нашы спатканні і спадзяванні* ***Поезд вясны*** *панёс.* (У. Мазго)

**Поле** ‘жыццё’. *А як пройдзем цераз гэта поле, што жыццём усе мы з вамі клічам, як паглянем стала, супакойна, ды нязробленае ўсё падлічым...* (У. Дубоўка)

**Пража.** *Звычайна* ***пража дзён*** *прадзецца, а ў памяці жыве, не знік, той стэп, а ў ім бяжыць, трасецца, з труной і плачам грузавік.* (К. Камейша) *Над абліччам маім ды заспаным ты снавала да сонца — ой, рана —* ***пражу сноў*** *залатога маленства.* (П. Трус)

**Пярун** ‘навала, бяда, няшчасце’. *Дзядзька Васіль, нібы той дуб-волат, цвёрда стаіць на зямлі, ніякіх* ***перуноў****, здавалася, не баіцца.* (І. Капыловіч*)* *Бо мой рубеж яшчэ не блізка, Хоць б’юць часамі* ***перуны****.* (С. Грахоўскі)

**Рака жыцця**. *І вось* ***рака*** *майго* ***жыцця*** *цячэ.* (С. Давідовіч) *Што* ***рака жыцця*** *табе рыхтуе — ты яшчэ не ведаеш дасюль.* (К. Камейша) *Сэрца ў змроку, у тузе патоне... Спыне ход* ***жыцця*** *майго* ***рака****.* (П. Пруднікаў)

**Ралля жыцця.** *Нікнем у* ***раллю жыцця*** *зернямі дакукі.* (Р. Барадулін)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Раўчук жыцця.** *У сыне гаварлівым жыве **раўчук жыцця**.* (Х. Чэрня)

**Саван жыцця**. *Ужо без слядоў і дарогі над чорнай імглой небыцця Прайшлі яго крохкія ногі па **саване** чорным **жыцця**.* (С. Гаўрусёў)

**Сажа** 'няўдача, непрыемнасць'. *І толькі стрыманае сэрца **Жыццёвай сажы** не кранецца.* (С. Гаўрусёў)

**Свечка 'жыццё'.** *Дачадзіць і сама гэта свечка, Недалёка сумотны канец.* (У. Жылка) *Патухла свечка мастака Юрыя Герасіменкі. Плача і стогне мая душа.* (У. Ліпскі)

**Світанак жыцця** 'перыяд юнацтва, маладосці'. *Нездарма ж мы на **світанку жыцця** любілі глядзець на зямлю праз каляровыя шкельцы.* (У. Караткевіч)

**Скразняк жыцця.** *Заўчасна б не прапасці На **скразняку жыцця**.* (М. Гудкова) *На **скразняках жыцця** акрэп, Не любіць грэцца Ля цяпельца славы.* (М. Маляўка)

**Соты быцця.** *Я слухаю, прысеўшы на калоды, Як вечнасць, асядаючы на дол, **Быцця** зямнога запаўняе **соты**.* (А. Грачанікаў)

**Старт** 'пачатак жыцця'. *Пройдзе люты — Мой **старт пажыццёвы**, Прашуміць, як віхор, нада мной.* (П. Прыходзька) *Не спяшайцеся, гады, на старце. Хочацца, каб крочылі цішэй! Не на фінішы я, ды і не на старце, Толькі ўсё ж да фінішу бліжэй.* (Ю. Свірка)

**Ствол жыцця.** *Ад змены не схавацца, Часова ўсё вакол. Ды будзе красавацца **Жыцця** зялёны **ствол**.* (С. Гаўрусёў)

**Стог**. *Мая бабулька Волька вяршыць **жыццёвы стог**. Не няньчылася доля, Быў літасцівы бог.* (Э. Акулін) *Старая чуе ростань. **Гадоў** саскублен **стог**.* (Р. Барадулін)

**Суквецце гадоў.** *Гусцее за спіной **гадоў суквецце**.* (Х. Жычка)

**Сякера** 'смерць'.*Чарнобылем, як і сосны, падсочаныя, мы чакаем сваёй сякеры*. (Р. Барадулін)

**Тартак** 'жыццё'. *Жыццё — **тартак**, пілуе нервы час, адчай, мана і здрада — пілавінне...* (Р. Баравікова)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Узбярэжжа жыцця.** *“Кінь стаяць на **жыцця узбярэжжы**”, — кліча вырай у сінім бязмежжы.* (Н. Арсеннева)

**Ускраек жыцця.** *Хмурны, іду я па **ўскрайку жыцця**.* (У. Марук) *Мой лёс, не скуголь беспрычынна, на **ўскрайку жыцця** памаўчы.* (С. Законнікаў)

**Ускрай маленства.** *Ён бачыў хаціну ды вішню з агрэстам — Далёка, на самым **ускраі маленства.*** (М. Арочка)

**Фінал** ‘канец жыцця’. *Гэта — прыгожы **фінал** прыгожага **жыцця**.* (П. Мядзёлка) *І ўсё ж настаў яго [Фаміча] фінал.* (А. Бачыла) ***Фінал быцця** твайго настолькі сумны, Як кроў вяселля на жыцця абрус.* (С. Каробкіна)

**Фініш** ‘канец жыцця’. *Я іду. Я ступаю павольна. Вось, здаецца, мой фініш мільгне. О, як цяжка ступаць, О, як больна на прыступку апошнюю мне.* (А. Зэкаў) *Мы ўжо — каля фінішу, Вы [маладыя] — яшчэ ля старту, Будзьце ж вы — у выйгрышы, Будзьце ж праўды вартыя.* (А. Бачыла)

**Хваля** ‘бурленне жыцця’. *Надзею майце, як якар душы, каб не захлынулі вас **хвалі жыццёвыя**.* (Р. Барадулін)

**Хмара** ‘бяда, жыццёвая непрыемнасць’. *На яе жыццё апала цяжкая чорная **хмара**.* (М. Машара) *Хвала табе, табе і ім, Хто здрады ў жыццейку не знаў, Нягледзячы на **хмары** бед.* (А. Гарун)

**Цыферблат** ‘жыццёвае кола’. *А сышло ці мала з цыферблата У нябыт сябровак і сяброў.* (К. Камейша)

**Чарнавікі жыцця.** *Чыставікі бяссоння, **Жыцця чарнавікі**.* (В. Стрыжак) *Першы снег, Як першае каханне, Азарыў душу маю і знік Чарна-троп спаткання, Снегавей расстання — **Чарнавік жыцця** І смерці белавік.* (Я. Хвалей)

**Частакол**. *Ён стукаў у шыбы старога жыцця, абнесенага частаколам.* (Т. Кляшторны) *Што гэта за лад, дзе таленту ўвесь час трэба прабівацца праз **жалезабетонны частакол** існуючых **догмаў** і штучна створаных **аўтарытэтаў**.* (З. Марозаў)

**Човен жыцця**. *Не вяслом, а пачынай лёгкай праўлю **човен** свайго **жыцця**.* (Э. Акулін)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Чыставік жыцця**. *Дармо, што лета рана дагарае І позна сніцца сіні красавік — Пачнём нанова сёння, дарагая, свайго жыцця суровы **чыставік**.* (А. Вялюгін)

**Шторм** ‘цяжкасці, выпрабавані жыцця’. *Мы ідзём праз **шторм** і буры, У твар парой сячэ і дождж і снег.* (Х. Жычка)

**Экватар** ‘палова жыцця’. *Над варонкаю з сынам стаю, **Дзён** сваіх перайшоўшы **экватар,** І праз трыццаць гадоў пазнаю Супакоены вогненны кратэр.* (С. Гаўрусёў)

**Ювелір** ‘жыццё’. *Куды б дарогі ні вялі, Куды б ні запрасіла сэрца, — Жыццё — удумны ювелір — Цябе сваім разцом кранецца.* (П. Прануза)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ